вания поданных транспортных средств, если это произошло вследствие военных действий. Ст. 854 устанавливает, что страховщик освобождается от выплаты страхового возмещения и страхового обеспечения, когда страховой случай наступил вследствие военных действий[12].

Таким образом, можно утверждать, что ведение войны не прекратило действия основополагающих принципов советского гражданского права, советское законодательство подлежало применению к правоотношениям, возникающим даже на оккупированных территориях. В то же время война не могла не повлиять на рассматриваемые правоотношения вовсе: в ряде случаев ограничивались как сфера применения гражданско-правового договора, так и права собственности (в частности, права добросовестных приобретателей), право на возмещение убытков, вызванных неисполнением обязательств контрагентом и др. Но, оценивая правовую систему государства, находящегося в состоянии войны, нельзя забывать о том, что его основной функцией становится защита граждан, оборона страны и сохранение ее территориальной целостности. В таких условиях государство стремится обеспечить законность и не допустить разграбления собственности предприятий и граждан, поступаясь ради достижения этой цели некоторыми правовыми принципами.

1 См.: Советское право в период Великой Отечественной войны / Под ред. И.Т. Голякова. М., 1948. Ч. 1. С. 16.
2 См.: Там же. С. 33.
3 См.: Стешенко Л.А., Шамба Т.М. История государства и права России. М., 2003. С. 346.
4 См.: Советское гражданское право. М., 1968. С. 397.
5 Советское право... С. 44.
6 См.: История Советского государства и права / Отв. ред. проф. А.П. Косицын. М., 1985. Кн. 3. С. 282.
7 См.: Советское гражданское право. С. 48.
8 См.: Ведомости Национального Собрания Республики Беларусь. 05.03.1999. № 7-9. Ст. 101.
9 См.: История государства и права СССР / Под ред. О.И. Чистякова, Ю.С. Кукушкина. М., 1971. С. 318.
10 См.: Там же. С. 319.

12 Ведомости...

Поступила в редакцию 05.05.05.

***Владимир Николаевич Сатолин*** - кандидат юридических наук, доцент кафедры теории и истории государства и права.
***Яна Анатольевна Ганкович*** - студентка 3-го курса юридического факультета.

*Т.І. ДОЎНАР, С.А. ГУР'ЕЎ*

# БЕЛАРУСКІ ПАРТЫЗАНСКІ РУХ У ЧАСЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

На основе анализа документально-правового и справочного материалов рассматриваются вопросы, касающиеся партизанского движения в годы Великой Отечественной войны. Отмечается существенный вклад белорусских партизан в дело победы над фашизмом.

Based on the documentary materials on Law and reference sources, the article considers the problems connected with the partisan movement during the Great Patriotic war. The authors emphasize the active resistance of the Belarusians to invaders and a substantial contribution of the Belarusian partisans to the victory over fascism

Разуменне сутнасці беларускай дзяжаўнасці немагчыма без асэнсавання трагічных і гераічных падзей перыяду Вялікай Айчыннай вайны (ВАВ), калі ставілася пытанне аб самім існаванні нашай нацыі. Па ўсеагульнаму прызнанню Беларусь з'яўляецца адной з самых пацярпелых рэспублік былога СССР ад фашысцкай навалы. Акупанты спалілі і разбурылі 209 з 270 гарадоў і раённых цэнтраў, 9200 сёл і вёсак, звыш 10 тыс. прадпрыемстваў. Вялікія страты панесла сельская гаспадарка. Надзвычайная Дзяржаўная камісія па даследаванню злачынстваў захопнікаў выявіла: толькі прамыя страты Беларусі за гады вайны склалі звыш 75 млрд р. у цэнах 1941 г. Гэта азначае, што рэспубліка

страціла больш за палову свайго нацыянальнага багацця. Аднак самыя цяжкія страты - гэта людскія. Колькасць толькі гарадскога насельніцтва ў Мінску да моманту вызвалення зменшылася на 40 %, у Магілёўскай вобласці - на 35 %, Палескай - 29, Віцебскай - 27, Гомельскай - 18 %. Каля трох мільёнаў жыхароў Беларусі засталіся без прытулку[1]. Акрамя таго, загінулі, пакінулі Беларусь ці не вярнуліся з эвакуацыі вялікая колькасць беларускіх яўрэяў, рускіх і палякаў[2].

У выніку вайны насельніцтва Беларусі ў 1945 г. скпала толькі 6,2 млн чал. Больш за 380 тыс. грамадзян было вывезена на працу ў Германію.

На акупіраванай немцамі тэрыторыі Беларусі быў усталяваны жорсткі фашысцкі рэжым, часткай якога сталі канцэнтрацыйныя лагеры. Лагер смерці ў Трасцянцы, што пад Мінскам, па колькасці знішчаных людзей (206 500 чал.) знаходзіцца на трэцім месцы пасля Асвенціма і Майданака. У лагерах над зняволенымі праводзіліся доследы, іх заражалі хваробамі, іх труцілі ў душагубках, здзекаваліся.

Вялізныя страты былі нанесены помнікам культуры Беларусі: вывозіліся карціны, кнігі, выдатныя помнікі старажытнасці з музеяў і шмат іншага.

З першых жа дзён вайны беларускі народ самаадданa змагаўся з ворагам. У працэнтных суадносінах да колькасці насельніцтва Беларусь выставіла шмат байцоў у рады Чырвонай Арміі. Таму можна сказаць, што беларусы праявілі фенаменальны подзвіг, прыкладаў якому цяжка знайсці ва ўсёй сусветнай гісторыі[3]. Менавіта гэтыя факты спрыялі таму, каб Беларусь стала паўнапраўнай краінай-заснавальніцай ААН. Такім чынам, усё міравое супольніцтва прызнала і ацаніла масавы гераізм нашага народа падчас вайны.

Вайна абумовіла ўсё культурнае, сацыяльна-эканамічнае, палітычнае і псіхалагічнае жыццё Беларусі на дзесяцігоддзі наперад, адбілася на менталітэце беларусаў.

Сітуацыя ў акупіраванай Беларусі была вельмі складаная і далёка не адназначная. У захопленай рэспубліцы пад уладай нацысцкага акупацыйнага рэжыму апынуліся каля 9 млн чал. Перад вайной колькасць насельніцтва складала звыш 10,5 млн чал. З пачаткам баявых дзеянняў у Чырвоную Армію было мабілізавана каля паўмільёна ваеннаабавязаных, звыш мільёна жыхароў эвакуіраваліся ў глыб краіны. У савецкія часы лічылася, што тыя, хто працаваў на немцаў у акупацыі, былі здраднікамі. Аднак жыццё людзей, апынуўшыхся ў тыле ворага, падпарадкоўвалася адвечным законам: пошуку сродкаў для існавання. Жыхары сельскай мясцовасці працавалі на зямлі і падтрымлівалі жыццё. У гарадах і рабочых паселішчах вельмі многія маглі выжыць, толькі ўладкаваўшыся на прадпрыемствы і ўстановы, працаваўшыя на акупантаў, тым больш, іх прымушалі да гэтага.

Сама рэчаіснасць паставіла мільёны беларусаў перад выбарам - прыстасавацца да жыццёвых абставін ці змагацца з акупантамі. Найбольш актыўныя жыхары, асабліва паўналетнія працаздольныя мужчыны, выбралі менавіта другі шлях. Ужо з першых месяцаў акупацыі Беларусі гітлераўцы сутыкнуліся з партызанскім рухам, падпольнай барацьбой, сабатажам, у якіх удзельнічала вялікая частка насельніцтва. Як адзначаюць даследчыкі, ужо ў канцы 1941 г. дзейнічала каля 100 партызанскіх атрадаў і прыблізна столькі ж партызанскіх груп. У першую чаргу са зброяй у руках супраць захопнікаў выступалі тыя, для каго прыход гітлераўцаў з'яўляўся непасрэднай пагрозай для жыцця, - партыйны, калгаСны, савецкі, камсамольскі актыў. У атрады і групы ўліваліся рабочыя-камуністы, служачыя, камсамольская моладзь. Разам з партыйным і службовым абавязкамі, жыццёвымі абставінамі на барацьбу з ворагам мабілізоўвалі патрыятычныя настроі, якія ў многіх выпадках былі звязаны з камуністычнай ідэалогіяй[4]. Але барацьба з фашызмам адбывалася не толькі на падставе марксісцка-ленінскай ідэалогіі, таму што ў пастулаты марксізму верылі далёка не ўсе. Народ Беларусі змагаўся згодна свайго менталітэта, не жадаў падпарадкоўвацца фашысцкаму насіллю. Зразумела, што некаторыя бароліся з акупантамі будучы людзьмі сумленнымі, хтосьці - з-за таго, каб не праслыць ворагам свайго народа.

Сярод партызан і падпольшчыкаў было многа людзей, якія жадалі, выгнаўшы захопнікаў, жыць інакш, чым жылі раней. Асабліва на такі настрой уплывала

гвалтоўна ўведзеная сістэма калгасаў, якая нанесла цяжкі ўдар па адвечнаму сялянскаму ўкладу жыцця. Аб гэтым сведчаць, напрыклад, факты, апублікаваныя ў мемуарах савецкіх кіраўнікоў, якія наведвалі партызанскія зоны ў перыяд вайны. Па прыбыцці на месца ім задавалі адно і тое ж пытанне - ці будуць пасля вайны калгасы? Што думаюць на гэты конт у Маскве?

Аб тым, што насельніцтва не было задаволена даваеннымі парадкамі, і гэта прыходзілася ўлічваць кіраўнікам партызанскіх атрадаў і злучэнняў, ёсць звесткі і ў нямецкіх дакументах. 22 студзеня 1941 г. з Беларусі ў Берлін кіраўніцтва паліцыі бяспекі і СД дакладала: "Аб прапагандзе партызан... У аддзельных справах, найперш за ўсё ў вуснай прапагандзе, усё часцей выказваюцца тэзісы аб тым, што савецкая ўлада распусціць калгасы і што распрацоўваецца новая канстытуцыя, якая дасць больш свабоды"[5]. Вядома, што пасля вайны сталінскі таталітарызм, выкарыстаўшы перамогу, аплачаную нечувальнымі ахвярамі народа, яшчэ больш умацаваўся.

Вядомы беларускі пісьменнік Алесь Адамовіч пісаў, што мы, партызаны, ілгалі калгаснікам, якія нам дапамагалі, што ўсё будзе пасля вайны па-іншаму[6].

Трэба адзначыць ролю партыйна-савецкага кіраўніцтва ў разгортванні ўсенароднага партызанскага руху. Аднымі з першых пачалі дзейнічаць Мінскі, Гомельскі, Пінскі абласныя і Гомельскі гарадскі падпольныя партыйныя і камсамольскія камітэты. Ужо ў чэрвені 1941 г. работнік Пінскага абкома партыі В.З. Корж сфарміраваў партызанскі атрад. Увосень 1941 г. ён на чале атрада разам з партызанамі Палесся і Міншчыны прайшоў з баявым рэйдам па тэрыторыях Палескай і Мінскай абласцей, захопленых ворагам. Народныя мсціўцы пад камандаваннем Камарова (падпольная мянушка В.З. Каржа) грамілі нямецкія гарнізоны, знішчалі сродкі сувязі, інфармавалі насельніцтва аб стане на франтах[7]. У гэты ж час у Суражскім раёне Віцебскай вобласці арганізаваў і ўзначаліў партызанскі атрад М.Н. Шмыроў. У Акцябрскім раёне Палескай вобласці пачаў дзейнічаць партызанскі атрад пад кіраўніцтвам У.П. Бумажкова і Ф.І. Паўлоўскага, а таксама можна назваць яшчэ шмат іншых атрадаў і груп, са стварэннем якіх на тэрыторыі рэспублікі фарміраваліся буйныя цэнтры партызанскага руху. Ва ўмовах нарастання супраціўлення насельніцтва рэспублікі фашыстам бальшавікі ўзмацнялі кіраўніцтва падполлем і партызанскім рухам. З гэтай мэтай на акупіраванай тэрыторыі Беларусі была створана шырокая сетка падпольных партыйных і камсамольскіх органаў, якія ўзначалілі барацьбу з нямецкімі акупантамі. Дзейнічалі 203 абкомы, міжрайкомы, міжрайпартцэнтры, гаркомы і райкомы КП(б)Б, больш за 1200 пярвічных партыйных арганізацый, 224 абласныя, міжраённыя, гарадскія і раённыя камітэты камсамола і звыш 5500 пярвічных камсамольскіх арганізацый. У партызанскіх атрадах і падполлі знаходзілася 135 тыс. камуністаў і камсамольцаў.

Вынікам партызанскага руху ўжо ў снежні 1941 г. стала значная дапамога беларускіх партызан Чырвонай Арміі ў барацьбе з захопнікамі. Так, у час бітвы пад Масквой; падпольшчыкі Мінска знішчылі дзве вадакачкі на чыгуначным вузле, 50 цягнікоў былі пашкоджаны; падпольшчыкі Оршы з лістапада 1941 па люты 1942 г. сапсавалі 170 цягнікоў і г. д.[8] Акрамя таго, з дапамогай падпольшчыкаў і партызан Беларусі тысячы былых вайскоўцаў былі вызвалены з фашысцкага палону і ўліліся ў рады партызан або пераходзілі лінію фронту і ўкпючаліся ў рэгулярную армію, змагаючыся ўжо на франтах.

Значны ўклад у перамогу над ворагамі ўнеслі падпольшчыкі. Восенню - зімой 1941/42 г. у гарадах і сёлах Беларусі працягваўся працэс стварэння і ўмацавання падпольных арганізацый. Гісторыя мінскага падполля мае некалькі перыядаў знішчэння і ўзнаўлення. Першыя падпольныя арганізацыі ўзнікалі стыхійна, і іх спробы дзейнасці не былі ўзгоднены з Масквой, таму многія ўдзельнікі пасля вайны аб'яўляліся здраднікамі. Падпольшчыкі не мелі вопыту нелегальнай барацьбы, таму многія з іх былі раскрыты і знішчаны ворагамі. Змагары не ўжывалі мянушак, выкарыстоўвалі свае імёны і прозвішчы, таму немцы іх лёгка выяўлялі. Аднак, нягледзячы на вялікія страты ў выніку масавых арыштаў (напрыклад, у Мінск" ў сакавіку і верасні 1942 г.), падпольшчыкі не спынялі барацьбу супраць нямецкіх захопнікаў. Яны арганізавалі шэраг буйных знішчальных аперацый на прамысловых і ваенных аб'ектах, транспарце. Толькі на

чыгуначным вузле ў другой палове 1943 г. падпольшчыкі горада лравялі больш за 50 дыверсій, а за тры гады акупацыі - больш за 1500 дыверсій[9].

Трэба адзначыць, што барацьба за сваю радзіму набыла такі размах, якога не ведала ні адна іншая краіна. Асабліва актывізаваліся партызанскі і падпольны рухі на Беларусі пасля перамогі савецкіх войск над нямецка-фашысцкімі захопнікамі пад Масквой і контрнаступлення Чырвонай Арміі зімой 1941/42 г. У гэты перыяд пачынаецца этап большага ўзгаднення, ўзаемадзеяння і каардынацыі партызан, падпольшчыкаў і ваеннага камандавання, што садзейнічала актывізацыі партызанскага руху на Беларусі. Асаблівую ролю адыгрываў Цэнтральны штаб партызанскага руху, створаны ўжо ў маі. 3 вясны 1942 г. партызанскі рух набыў больш масавы, народны характар. Да лістапада 1942 г. ужо налічвалася 430 партызанскіх атрадаў, на базе якіх былі створаны брыгады і злучэнні. Першыя такія фарміраванні ўзніклі ў Віцебскай і Мінскай абласцях. У канцы года налічвалася 59 партызанскіх брыгад, стварэнне якіх давала магчымасць партызанам праводзіць буйныя аперацыі па знішчэнню гарнізонаў ворага і яго камунікацый.

3 мэтай цэнтралізацыі аператыўнага кіраўніцтва партызанскім рухам у маі 1942 г. пры Стаўцы Вярхоўнага Галоўнакамандуючага быў створаны Цэнтральны штаб партызанскага руху (ЦШПР), начальнікам якога стаў першы сакратар ЦК КП(б)Б П.К. Панамарэнка. 3 верасня 1942 г. пачаў працаваць Беларускі штаб партызанскага руху (БШПР), які ўзначаліў другі сакратар ЦК КП(б)Б П.З. Калінін. Штаб каардынаваў узаемадзеянне паміж усімі сіламі, планаваў найбольш буйныя аперацыі, адпраўляў спецыялістаў для правядзення дыверсій і кіраваў дзейнасцю партызанскіх атрадаў і брыгад, а таксама аказваў ім дапамогу кадрам!, зброяй, боепрыпасамі, сувяззю і інш.

У выніку ўзмацнення партызанскага руху некаторыя раёны рэспублікі былі вызвалены ад ворага. К канцу 1943 г. партызаны ўтрымлівалі і кантралявалі каля 60 % тэрыторыі Беларусі, на якой было створана звыш 20 буйных партызанскіх зон. Першыя з іх узнікалі яшчэ восенню 1941 г. Найбольш буйнымі зонамі з'яўляліся Акцябрска-Любанская, Барысаўска-Бягомльская, Крычаўская, Полацка-Лепельская, Расонска-Асвейская і інш. Пры аб'яднанні некалькіх зон утвараліся партызанскія краі. Важным было тое, што сотні тысяч людзей жылі ў партызанскіх зонах, і там захоўвалася савецкая ўлада. Кіраўніцтва партызанскага руху выконвала амаль усе функцыі савецкіх органаў улады і кіравання. Зоны з'яўляліся агітацыйна-прапагандысцкімі цэнтрамі. Тут выпускаліся газеты, працавалі радыёстанцыі, праводзіліся гутаркі, лекцыі, дэманстраваліся кінафільмы. У тыле ворага выдавалася 162 газеты, у тым ліку 12 рэспубліканскіх і абласных[10].

Зразумела, што такія абставіны на захопленай тэрыторыі Беларусі не адпавядалі палітычным мэтам акупантаў. Гітлераўцы неаднойчы спрабавалі знішчыць партызан. Яны жорстка каралі насельніцтва за ўдзел у партызанскім руху, спальваючы датла вёскі і сёлы разам з жыхарамі. Аднак масавыя карныя аперацыі не прыносілі немцам жаданых вынікаў. Партызанскі вызваленчы патрыятычны рух нарастаў і пашыраўся[11].

3 мэтай дэзарганізацыі ворага і ўзмацнення партызанскага руху праводзіліся рэйды, у час якіх партызаны знішчалі нямецкія гарнізоны, паліцэйскія ўчасткі, разбуралі камунікацыі. У верасні - лістападзе 1943 г. Беластоцкае партызанскае злучэнне правяло 1000-кіламетровы рэйд па Мінскай, Пінскай, Баранавіцкай, Брэсцкай і Беластоцкай абласцях. Паспяхова прайшоў восенню 1943 г. рэйд брыгады імя А.К. Флегантава з Мінскай у Брэсцкую вобласць. Партызанскі рух карыстаўся падтрымкай мясцовага насельніцтва. Яно забяспечвала партызан прадуктамі і адзеннем, вяло разведвальную работу, збірала і перадавала ім зброю і боепрыпасы, удзельнічала ў баявых аперацыях. У ліпені 1943 г. каля 3 тыс. мясцовых жыхароў прымалі ўдзел у разбурэнні чыгуначнага палатна на ўчастку Орша - Лепель. Партызанам аказвалася разнастайная дапамога з-за лініі фронту. Толькі з лета 1942 па сакавік 1944 г. яны атрымалі 80 тыс. вінтовак, аўтаматаў, кулямётаў, 100 млн патронаў, 400 т узрыўчаткі. Працоўныя савецкага тылу накіроўвалі партызанам пасылкі з абмундзіраваннем, цёплым адзеннем, медыкаментамі, харчамі, праводзілі збор сродкаў у фонд дапамогі партызанам.

партызанам. У гады ВАВ на Беларусі ў радах партызан знаходзілася 374 тыс., у падполлі - звыш 70 тыс. чалавек.

Нельга не закрануць і такую праблему, як знішчэнне ў гэты ж час партызанскіх кадраў Беларусі, што праводзілася карным сталінскім органам. Так, восенню 1942 г. быў адазваны і расстраляны вядомы партызанскі кіраўнік палкоўнік В.І. Нічыпаровіч. У 1943 г. быў арыштаваны камбрыг партызанскай брыгады "Стары" Мінскай вобласці В.С. Пыжыкаў. У час вайны і асабліва пасля былі рэпрэсіраваны сотні партызан і падпольшчыкаў (асабліва мінскага падполля). Любы партызан ці партызанскі агент мог быць абвінавачаны ў супрацоўніцтве з немцамі.

Звярнем увагу і на тое, што ў час акупацыі існавала нешматлікае беларускае нацыянальнае антыфашысцкае падполле. Палітычна яно было прадстаўлена Партыяй беларускіх нацыяналістаў на чале з Я. Станкевічам і В. Іваноўскім, а ў сваіх спадзяваннях арыентавалася на заходнія дзяржавы. Партыя беларускіх нацыяналістаў праводзіла барацьбу супраць немцаў, але выступала за аднаўленне самастойнасці пасля вайны, чым вызывала незадаволенасць Масквы[12]. Супраць Станкевіча і Іваноўскага было праведзена некалькі акцый з боку НКУСа, а таксама партызан[13].

Разам з беларусамі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў змагаліся прадстаўнікі многіх народаў СССР. Варта адзначыць, што жыхары нашай рэспублікі складалі да 90 % ад агульнай колькасці народных мсціўцаў. Паводле звестак БШПР, па свайму сацыяльнаму складу (да пачатку вайны) гэтыя людзі размяркоўваліся наступным чынам: на долю сялян прыпадала 39,1 % ад усёй колькасці партызан, інтэлігенцыі і служачых - 20,55, рабочых - 17,03; навучэнцаў - 12,16, былых ваеннаслужачых - звыш 11 %. У складзе партызан Беларусі змагаліся сотні польскіх грамадзян, больш за 400 славакаў і чэхаў, 235 югаславаў, каля 70 венграў, 60 французаў, звыш 30 грамадзян Бельгіі, 24 аўстрыйцы, 16 галандцаў, прадстаўнікі іншых еўрапейскіх народаў - усяго каля 4 тыс. антыфашыстаў замежных краін[14].

Партызаны і падпольшчыкі забілі і паранілі больш за 500 тыс. гітлераўцаў, нанеслі цяжкія страты ворагу ў тэхніцы. Столькі Германія не страчвала ў ніводнай краіне Заходняй Еўропы. За гераізм і адвагу каля 140 тыс. партызан і падпольшчыкаў узнагароджаны ордэнамі і медалямі, 88 з іх прысвоена званне Героя Савецкага Саюза[15].

Усяго на тэрыторыі Беларусі было зарэгістравана 440 тыс. змагароў, але, канешне, гэтая лічба недакладная. Вялікая колькасць безыменных герояў загінула на пачатку вайны і таму не была ўлічана. Так, па даных БШПР, у 1941 г. страты партызан склалі ўсяго 147 загінуўшых, але, зразумела, што іх было значна больш. Усяго колькасць загінуўшых партызан за перыяд ВАВ складае прыблізна каля 25 681 чал., з іх 16 804 беларусы, 5599 рускіх, 1258 украінцаў і інш. Таму адным з вырашальных фактараў, абумовіўшых Вялікую Перамогу, была непарушальная ў той час дружба народаў СССР[16].

Такім чынам, можна сказаць, што разам з мабілізаванымі агульная колькасць змагаўшыхся беларусаў перавышала 70 працэнтаў ад усяго працаздольнага мужчынскага насельніцтва. Гэта таксама ўражвае, бо ў сярэднім па СССР гэты працэнт складае каля 40[17].

Адразу пасля вызвалення тэрыторыі Беларусі ад акупантаў, якое пачалося ўжо з восені 1943 г., аднаўлялі сваю дзейнасць савецкія органы ўлады. Перш за ўсё пачалі працаваць выканкомы мясцовых Саветаў, якія прымалі неадкладныя меры па ўзнаўленню народнай гаспадаркі і ліквідацыі наступстваў акупацыйнага рэжыму.

Сёння, на пачатку XXI стагоддзя, вельмі важна для ўсіх нас успомніць урокі, якія дала нам ВАВ, яшчэ раз ацаніць вялікі подзвіг нашых продкаў.

[1] Гл.: Голенченко Г.Я., Осмоловский В.П. История Беларуси: вопросы и ответы. Мн., 1993. С. 182-183.
[2] Гл.: Шевцов Ю. Из лесов, болот и землянок // Дело. № 7. 1996. С. 8-24.

[3] Великая Отечественная война Советского Союза 1941-1945 гг. Краткая история. 2-е изд., испр. и доп. М., 1970. С. 124-173.
[4] Гл.: Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне. 1941-1945. Мн., 1990.
[5] Цыт. па: Великая Отечественная война 1941-1945 гг. Краткий научно-популярный очерк. 2-е изд. М., 1973.
[6] Белорусская деловая газета. 03.02.03. № 13.
[7] Гл.: Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне. 1941-1945 гг. Бібліяграфічны паказальнік. Мн., 1995-1996.
[8] Гл.: Независимое военное обозрение. 21.05.2004.
[9] Гл.: Партызанская барацьба беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Мн., 1959. С. 337-403.
[10] Гл.: Горанский М.Н., Гавриловец В.М. 30-я годовщина освобождения БССР от немецко-фашистских захватчиков. Мн., 1974. С. 7-43.
[11] Гл.: Нехай Е.П., Прохорович Н.Е. Всенародное партизанское движение в Беларуси в годы Великой Отечественной войны. Мн., 1982. С. 509-553.
[12] Гл.: Ліцбіч Ю. Антыбальшавіцкія паўстаньні І партызанская барацьба на Беларусі. Нью-Ёрк, 1996. С. 63-69.
[13] Гл.: Loftus J. The Belarus Secret. NewYork, 1985. P. 17.
[14] Гл.: Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне, 1941-1945 гг. // Энцыклапедыя. Мн., 1990.
[15] Гл.: Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне, 1941-1945 гг. Бібліяграфічны паказапьнік. Мн., 1995-1996.
[16] Гл.: Самсонов А.М. Освобождение Беларуси 1944 г. М., 1974. С. 170-197.
[17] Loftus J. The Belarus Secret. NewYork, 1985. P. 17.

Паступіў у рэдакцыю 20.05.05.

***Таісія Іванаўна Доўнар*** - доктар юрыдычных навук, прафесар кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы І права.

***Сяргей Аляксандравіч Гур'еў*** - студэнт 3-га курса юрыдычнага факультэта.